**ЯК МІКАЛАЙ МІСІЮК ЗАВАЯВАЎ СВЕТ ГЕАГРАФІІ**
Пра пераможцу міжнароднай алімпіяды
Стар. 2

**ФМА БДУ**
30 гадоў рыхтуем тых, хто прадстаўляе Беларусь у свеце
Стар. 3

**СТАГОДДЗЕ ПРАВА**
Альма-матар беларускіх юрыстаў адзначае юбілей
Стар. 4-5

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»

16 кастрычніка 2025 года, №10 (2301)

## БЫЦЬ НАСТАЎНІКАМ — ЗНАЧЫЦЬ БУДАВАЦЬ БУДУЧЫНЮ: РАЗМОВА РЭКТАРА СА СТУДЭНТАМІ ПЕДАГАГІЧНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯЎ

**Рэктар БДУ Андрэй Кароль сустрэўся з першакурснікамі педагагічных спецыяльнасцяў універсітэта.**




Мерапрыемства адбылося напярэдадні Дня народнага адзінства. Са слоў кіраўніка БДУ, гэта свята мае фундаментальнае значэнне для развіцця нашай краіны.

– *Знакавы дзень накіраваны на ўмацаванне нацыянальнай ідэнтычнасці ўсяго беларускага народа. Ён нясе ў сабе важныя ідэі міру і яднання, якія асабліва актуальныя ў наш час,* – падкрэсліў Андрэй Кароль. Таксама ён дапоўніў, што сёння ўсё часцей адбываецца сціранне нацыянальных асаблівасцяў дзяржаў, аддаленне людзей адно ад аднаго, з'яўляюцца спробы пабудовы «вавілонскай вежы XXI стагоддзя». Для захавання выключнасці Беларусі, на думку кіраўніка БДУ, варта звяртацца да розных формаў зносін з моладдзю.

Размова рэктара з першакурснікамі адбылася ў свабоднай форме. Удзельнікі абмеркавалі актуальныя тэмы для моладзі. Са слоў Андрэя Караля, выбар студэнцкай аўдыторыі прадыктаваны самім часам. Сёння ў свеце тэхналагічнага прагрэсу роля настаўніка становіцца ўсё больш актуальнай. Менавіта педагог здольны раскрыць унутраны патэнцыял дзіцяці, выхаваць творчую асобу, якая думае. Таму важна весці даверны і адкрыты дыялог са студэнтамі, якім у найбліжэйшай будучыні трэба будзе працаваць з палкімі і маладымі розумамі нашай краіны.

Сустрэча была напоўнена тэматычнай разнастайнасцю пытанняў. Студэнты пыталі пра сучасныя метады навучання, перспектывы развіцця айчыннай школьнай і ўніверсітэцкай адукацыі. Са слоў рэктара, сёння маладому пакаленню важна навучыцца выбудоўваць унікальную траекторыю свайго жыцця. Для гэтага патрабуюцца досвед старэйшага пакалення, асобасны падыход выкладчыка і матываванасць самога навучэнца. Адказваючы на пытанне пра ўнутраныя якасці сапраўднага педагога, Андрэй Кароль адзначыў чалавекалюбства, уважлівасць да сутнасці любога працэсу і з'явы.



Натхніла першакурснікаў тэма адметных рыс адукаванага чалавека. Сярод іх рэктар вылучыў уменне вучыцца, змяняць сябе, выходзіць за свае межы і глядзець на рэчы з розных бакоў, заглыбляцца ў розныя галіны ведаў. Закранулі ўдзельнікі сустрэчы і эфектыўныя спосабы данясення інфармацыі. Тут навучэнцы абмяняліся меркаваннямі пра сучасныя платформы і сацыяльныя сеткі. Досведам вядзення тэлеграм-канала таксама падзяліўся Андрэй Кароль. Па яго меркаванні, гэта добрая магчымасць знайсці аўдыторыю аднадумцаў, пабачыць розныя пункты гледжання і зразумець асноўныя запыты грамадства.

Гаварылі студэнты з рэктарам і пра асабістае. Кіраўнік ВНУ распавёў пра свой прафесійны шлях і паразважаў, з якім вядомым навукоўцам хацеў бы пагутарыць. У прыватнасці, Андрэй Кароль назваў Сакрата. З яго слоў, гэта знакавая фігура ў гісторыі чалавецтва і заходнееўрапейскай філасофскай думкі.

Сваімі ўражаннямі ад сустрэчы падзяліліся ўдзельнікі. Студэнтка факультэта сацыякультурных камунікацый Ганна Ляхоўчык адзначыла, што перадсвяточны дзень падарыў выдатную магчымасць успомніць пра гістарычную спадчыну нашай краіны.

– *Сустрэча рэктара з навучэнцамі ўсіх факультэтаў у адной аўдыторыі дазволіла адчуць яднанне і агульнасць, а таксама падарыла новыя знаёмствы і яскравыя ўражанні,* – сказала Ганна.

Пра значнасць захавання нацыянальнай памяці распавёў будучы гісторык Максім Куніца. На думку першакурсніка, штогадовае правядзенне Рэспубліканскай дыктоўкі дапамагае захаванню галоўных старонак агульнага мінулага. Падтрымала Максіма навучэнка механіка-матэматычнага факультэта Арыяна Варвашэвіч. Дзяўчына не ўпершыню бярэ ўдзел у дыктоўцы і перакананая, што актыўнасць і ўцягнутасць усіх грамадзян у асветніцкія ініцыятывы дазволяць захоўваць суверэннасць і росквіт Беларусі.

Нагадаем, у гонар Дня народнага адзінства на ўсіх факультэтах і інстытутах БДУ было запланавана больш за 50 мерапрыемстваў. Дадзенаму дню былі прысвечаны куратарскія і інфармацыйныя гадзіны, выставы, дыялогавыя пляцоўкі, акцыі і конкурсы. Працягнулася святкаванне на ўрачыстай лінейцы ва ўнутраным дворыку ВНУ з удзелам кіраўніцтва, студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
16 кастрычніка 2025 года, №10 (2301)

# ЯК МІКАЛАЙ МІСІЮК ЗАВАЯВАЎ СВЕТ ГЕАГРАФІІ



**Яго дзіцячы пакой у Брэсце нагадваў картаграфічны аддзел: карты раёнаў, гарадоў, а на самым бачным месцы – свету. Цяпер жа Мікалай пакінуў свой след на карце міжнародных дасягненняў, заваяваўшы найвышэйшую ўзнагароду на Міжнароднай алімпіядзе па геаграфіі. Але шлях да гэтага поспеху пачаўся не з падручнікаў, а з любові да падарожжаў па Беларусі і настаўніцы, якая здолела разгадаць у ім прагу да навукі.**

Цікавасць да геаграфіі прачнулася ў Мікалая яшчэ ў раннім дзяцінстве. Як дзеліцца ўражаннямі сам малады чэмпіён, яго атачалі самыя розныя карты. «Яшчэ ў 6 гадоў я могназваць сталіцы многіх краін», – з усмешкай заўважае ён. Кожная сямейная паездка па Беларусі папаўняла хатнюю калекцыю новымі картамі гарадоў, якія хлопчык з задавальненнем вывучаў, у думках паўтараючы маршруты. Аднак сапраўдны запал да прадмета, па яго словах, з'явіўся у 6 класе, калі пачалося вывучэнне фізічнай геаграфіі. Вялікую ролю ў гэтым сыграла яго настаўніца Юлія Віктараўна Багдасарава. Менавіта тады цікавасць да геаграфіі ўспыхнула з новай сілай і больш не згасала.

Свой шлях у алімпіядным руху малады чалавек пачаў з выпрабаванняў па розных прадметах. Аднак стабільна высокія вынікі дэманстраваў менавіта ў геаграфіі. Першым сур'ёзным рубяжом стаў выхад у 9 класе на заключны этап рэспубліканскай алімпіяды. Менавіта ў перыяд падрыхтоўкі да «рэспублікі» да яго прыйшло ўсведамленне.

– *Я зразумеў, што сапраўды люблю гэты прадмет і хацеў бы звязаць з ім сваё жыццё,* – успамінае сваю думку Мікалай.

Стаўшы кандыдатам у нацыянальную каманду, ён, хоць і не прайшоў адразу на міжнародны ўзровень, быў натхнёны прыкладам больш дасведчаных аднагодкаў. Настойлівасць была недарэмнай: у 10 класе ён заваяваў дыплом I ступені на рэспубліканскай алімпіядзе і атрымаў права прадстаўляць краіну на двух прэстыжных спаборніцтвах.

– *Усё лета актыўна рыхтаваўся да гэтых спаборніцтваў, вынік – абсалютная перамога ў Сербіі на 10-й Еўрапейскай геаграфічнай алімпіядзе і серабро на 20-й Міжнароднай геаграфічнай алімпіядзе ў Ірландыі,* – дзеліцца ён сваімі дасягненнямі.

У 11 класе ён паўтарыў свой бліскучы поспех на рэспубліканскім узроўні і быў адабраны для ўдзелу ў 21-й Міжнароднай геаграфічнай алімпіядзе ў Тайландзе і 18-й Міжнароднай алімпіядзе па навуках аб зямлі ў Кітаі, з годнасцю завяршыўшы сваю школьную алімпіядную кар'еру.

– *Мая перамога – падстава для гордасці вялікай колькасці людзей: сям'і, сяброў, школы, горада Брэста, ды і наогул усёй Беларусі,* – дадае наш герой.

Пры гэтым юнак захоўвае прыродную сціпласць. Магчыма, гэта не дае яму цалкам зразумець, што менавіта ён адчувае, калі ўсе вакол называюць хлопца «абсалютам» або чэмпіёнам. Алімпіядны рух у 9-11 класах быў значнай часткай жыцця школьніка, і абсалютнае золата – вынік, пра які яшчэ 3 гады таму Мікалай не мог і марыць.

За ўсімі гэтымі поспехамі стаіць каласальная праца і строгая самадысцыпліна. Студэнт называе сябе «чалавек-расклад» і расказвае, што падчас падрыхтоўкі мог прысвячаць геаграфіі да 6, а то і 8 гадзін у дзень. Як адзначае малады чалавек, у 11 класе было даволі цяжка сумяшчаць падрыхтоўку да алімпіяды са школьнымі ўрокамі, сваімі хобі, экзаменамі, выпускным, паступленнем ва ўніверсітэт. Прыходзілася шмат чым ахвяраваць. Але пры гэтым жыццё яшчэ школьніка не круцілася вакол алімпіяд. Каб пазбегаць выгарання і засвоіць назапашаную інфармацыю або проста адпачыць, ён свядома пераключаўся на іншыя справы.

Найважнейшай апорай для яго, акрамя сям'і і педагогаў, сталі іншыя канкурсанты. Гэта тыя людзі, хто больш за ўсё разумее спецыфіку і сутнасць такіх спаборніцтваў. Першакурснік падкрэслівае, што, нягледзячы на канкурэнцыю, алімпіяднікі заўсёды падтрымлівалі адзін аднаго.



– *Часам дзякуючы людзям, якія побач са мной падчас алімпіяд, я не адчуваю сябе замкнёным, а алімпіяда ўспрымаецца як новая прыгода. Іх рэакцыя пасля маёй перамогі, як і мая, невымоўная,* – кажа ён.

У перыяды напружанай падрыхтоўкі ратавалі хобі. Як адзначае студэнт, больш за дзесяць гадоў яго жыццё было цесна звязанае з узорным ансамблем народнага танца «Крынічка» ў Брэсце. Калектыў такі прыязны, што для юнака танцы сталі чымсьці большым, чым проста заняткам. Апрача гэтага, маладога чалавека захапляе культура розных краін свету, асабліва іх музыка. Калі Мікалай вывучаў геаграфію некаторых краін, паралельна спрабаваў ствараць плэйлісты з іх музыкай. Некалькі разоў веды пра культуру, атрыманыя такім чынам, дапамагалі адказаць на пытанні алімпіяд па геаграфіі.

Цяпер жа, пасля вяртання з апошняй алімпіяды, калі, здавалася б, усё ўжо ў мінулым, малады чалавек прызнаецца, што вельмі стаміўся ад усяго. Пачатак вучобы ва ўніверсітэце супаў з маральнай стомленасцю, і цяпер яму патрэбны час, каб перазагрузіцца і ўзяцца за новыя адкрыцці, цалкам адчуць усю атмасферу студэнцкага жыцця.

Асвойвацца ва ўніверсітэце дапамагаюць і студэнцкія мерапрыемствы. Так, малады географ ужо ўдзельнічае ў «Капусніку» і YFM. У творчай атмасферы значна лягчэй знаёміцца з аднакурснікамі і іншымі студэнтамі.

Гаворачы пра будучыню, Мікалай адчувае пэўны цяжар чаканняў.

– *Сапраўды, ёсць нейкі ціск. Шмат хто бачыць мяне ў будучыні добрым навуковым работнікам, прадвяшчаючь вялікую будучыню,* – канстатуе ён.

Аднак ён выразна разумее, што патрэбная яго ўласная ініцыятыва. Малады чалавек хоча рабіць пэўныя крокі ў гэтым кірунку, але бярэ невялікую паўзу, каб спачатку адпачыць і набрацца сіл пасля алімпіяд.

Сваім пераемнікам Мікалай раіць захоўваць здаровы баланс. Не варта ўсё даводзіць да моманту, калі акрамя алімпіяды ў жыцці нічога няма. Важна ўмець адцягвацца на што-небудзь іншае, прапануе хлопец. На яго погляд, ключ да поспеху не ў завучванні фактаў. Для таго, каб добра пісаць алімпіяды, зусім не абавязкова быць «хадзячай энцыклапедыяй», і на сваім прыкладзе студэнт у гэтым пераканаўся. Галоўнае – зразумець спецыфіку алімпіяд, вызначыць, у якіх галінах ёсць відавочныя прагалы, каб папоўніць свае веды ў патрэбным для сябе рэчышчы.

Гісторыя Мікалая – гэта не проста аповед пра перамогі. Гэта гісторыя пра тое, як дзіцячае захапленне, падмацаванае працавітасцю, падтрымкай асяроддзя і здаровым стаўленнем да жыцця, можа вырасці ў сур'ёзнае дасягненне. Яго прыклад даказвае, што сапраўдны поспех прыходзіць да таго, хто ўмее не толькі старанна працаваць, але і пераключацца на свае хобі, напрыклад, на танцы ці музыку, знаходзячы ў гэтым натхненне для новых подзвігаў.

**Марыя КАРКВЕЛІС**

# ФМА БДУ: 30 ГАДОЎ РЫХТУЕМ ТЫХ, ХТО ПРАДСТАЎЛЯЕ БЕЛАРУСЬ У СВЕЦЕ

**Гісторыя факультэта міжнародных адносін БДУ непарыўна звязаная са станаўленнем маладой беларускай дзяржавы. Восенню гэтага года, калі БДУ святкуе свой 104 дзень нараджэння, сам факультэт падводзіць вынікі 30 гадоў дзейнасці. Створаны ў 1995 годзе, ФМА за тры дзесяцігоддзі прайшоў шлях ад маленькага падраздзялення да вядучага навучальна-навуковага цэнтра, які выпусціў больш за 10 тысяч спецыялістаў для працы на міжнароднай арэне.**




Цяпер ФМА прапануе шырокі спектр адукацыйных праграм, які ўключае 8 спецыяльнасцяў бакалаўрыята, 6 – магістратуры і 9 – аспірантуры. Унікальнымі для Беларусі з'яўляюцца праграмы па «міжнародных адносінах», «міжнароднай лагістыцы», «міжнароднай канфлікталогіі», «афрыканістыцы» і «ўсходазнаўстве». Ключавая канкурэнтная перавага – комплексны міждысцыплінарны падыход, дзе навучальныя дысцыпліны спецыяльнасцяў цесна спалучаюцца з паглыбленым вывучэннем 16 замежных моў.

Факультэт аб'ядноўвае тры профілі адукацыі: «Грамадскія навукі, журналістыка і інфармацыя», «Бізнес, кіраванне і права» і «Службы». Падрыхтоўка вядзецца ў сферах міжнародных адносін, права, эканомікі, канфлікталогіі, лагістыкі, мытнай справы, менеджменту ў турызме і ўсходазнаўства.

## СТУДЭНТЫ І ВЫКЛАДЧЫКІ

ФМА традыцыйна лідзіруе ў БДУ па самых высокіх прахадных балах. Усе студэнты адрозніваюцца высокім узроўнем ведаў: каля 30% складаюць медалісты, 50% – выпускнікі ліцэяў і гімназій. Штогод дыпломы з адзнакай атрымліваюць каля 20% выпускнікоў. На факультэце зараз навучаецца 1838 чалавек, з якіх 27% – 492 замежныя студэнты з 24 краін. Доля беларускіх студэнтаў з рэгіёнаў дасягае 57%.

Навукова-педагагічную працу вядзе 181 штатны выкладчык, у тым ліку 12 дактароў і 55 кандыдатаў навук. Сярэдні ўзрост прафесарска-выкладчыцкага складу факультэта – 46 гадоў, 37% маюць навуковую ступень.

## МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА І НАВУКОВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Факультэт актыўна развівае міжнародныя сувязі. Рэалізуюцца 2 сумесныя магістарскія праграмы з ВНУ Расіі («Еўразійская інтэграцыя» з Маскоўскім дзяржаўным інстытутам міжнародных адносін МЗС Расійскай Федэрацыі і «Дзяржаўнае кіраванне ў міжнародных эканамічных адносінах» з Белгародскім дзяржаўным нацыянальным даследчым універсітэтам). Распрацоўваюцца міжнародныя сумесныя праграмы бакалаўрыята па спецыяльнасцях «менеджмент у сферы міжнароднага турызму і гасціннасці» з Гуанчжоўскім гандлёва-прамысловым універсітэтам і «міжнародная лагістыка» з Цындааскім партовым прафесійна-тэхнічным інстытутам у КНР. З 2025/2026 навучальнага года пачалася падрыхтоўка бакалаўраў на англійскай мове па спецыяльнасці «міжнародныя адносіны». ФМА таксама забяспечвае адукацыйны працэс у Сумесным інстытуце БДУ і Далянскага політэхнічнага ўніверсітэта для курсантаў ваеннага факультэта (прафілізацыі «міжнародныя адносіны ў ваеннай сферы», «міжнародныя адносіны ў інфармацыйна-аналітычнай сферы»). У прыватнасці, для студэнтаў ваеннага факультэта арганізавана навучанне першай замежнай мове ў асобных групах, дзе выкладаецца ваенная лексіка і дысцыпліны па ваенным перакладзе, што адпавядае патрабаванням Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь.

У красавіку 2000 года быў створаны цэнтр міжнародных даследаванняў ФМА як структурнае падраздзяленне БДУ ў выніку сумеснай ініцыятывы БДУ і МЗС Рэспублікі Беларусь. Цэнтр з'яўляецца партнёрам Форуму Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ад Рэспублікі Беларусь.

Міжнародная дзейнасць ахоплівае не толькі традыцыйную знешнепалітычную сферу (дыпламатычную), але і прадстаўлена ў любым органе дзяржаўнага кіравання, прадпрыемстваў рознай формы ўласнасці, прадугледжвае гуманітарнае і інфармацыйнае вымярэнне, узаемадзеянне ў міжнародна-прававой сферы.

На факультэце дзейнічаюць 4 навуковыя школы, штогод праводзіцца больш за 50 міжнародных навуковых мерапрыемстваў, выдаюцца 3 рэцэнзаваныя часопісы. З 1998 года абаронены 15 доктарскіх і больш за 80 кандыдацкіх дысертацый. Працуюць 8 студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый і 28 навуковых гурткоў, у якіх прымаюць удзел больш за 500 студэнтаў. У розныя гады СНДЛ ФМА займалі першыя месцы ў розных намінацыях конкурсу БДУ на найлепшую СНДЛ. Найлепшымі моладзевымі праектамі БДУ станавіліся: ініцыятыва «Мадэляванне ААН» (упершыню для беларускіх студэнтаў было праведзена факультэтам у 1999 годзе), студэнцкая лабараторыя «СТАРТ», школа па міжнародным касмічным праве.



## КАР'ЕРА ВЫПУСКНІКОЎ І ВЫХАВАЎЧАЯ РАБОТА

Падрыхтоўка спецыялістаў у сферы міжнароднай дзейнасці накіраваная на фарміраванне ў навучэнцаў глыбокіх прафесійных ведаў, высокай асабістай культуры, патрыятызму, здольнасці да дзяржаўнага мыслення і адстойвання нацыянальных інтарэсаў на міжнароднай арэне, умення працаваць у хутказменлівым полікультурным міжнародным асяроддзі.

Размеркаванне выпускнікоў складае 100%, прычым каля 47% працаўладкоўваюцца на прадпрыемствах дзяржаўнай формы ўласнасці. Выпускнікі ФМА працуюць у МЗС (складаючы больш за 30% яго супрацоўнікаў), Дзяржаўным мытным камітэце, міністэрствах эканомікі, юстыцыі, спорту і турызму, а таксама ў міжнародных арганізацыях і рэальным сектары эканомікі.

Ідэйная і выхаваўчая работа ўключае дысцыпліны: «Паліталогія», «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа» і «Дзяржаўная служба». З 2021 года на пастаяннай аснове працуюць дыялогавыя пляцоўкі «Размова з міністрам» і «Беларусь – свету». Студэнты актыўна ўдзельнічаюць у валанцёрскім руху, суправаджаючы буйныя міжнародныя мерапрыемствы, такія як Гульні СНД і канферэнцыі, прысвечаныя еўразійскай інтэграцыі і бяспецы.

Прайшоўшы шлях ад ініцыятывы па стварэнні дыпламатычнай службы маладой рэспублікі да флагмана міжнароднай адукацыі краіны, ФМА БДУ ўпэўнена глядзіць у будучыню. Яго гісторыя – гэта яскравы прыклад паспяховага ўвасаблення дзяржаўнай волі ў якасную падрыхтоўку кадраў. Сёння, напярэдадні свайго 30-годдзя, факультэт з'яўляецца не проста структурным падраздзяленнем, а неад'емнай часткай спадчыны і сучаснага поспеху Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, які святкуе 104-годдзе. Гэтае двайное свята сімвалізуе трывалую сувязь пакаленняў, традыцый і наватарства, забяспечваючы пераемнасць ведаў і патрыятычных каштоўнасцяў для будучых поспехаў Беларусі на сусветнай арэне.

**Марыя КАРКВЕЛІС**

УНІВЕРСІТЭТ
16 кастрычніка 2025 года, №10 (2301)

# СТАГОДДЗЕ ПРАВА: АЛЬМА-МАТАР БЕЛАРУСКІХ




**Юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта адзначае стагоддзе з дня заснавання, падводзячы вынікі свайго значнага шляху ў развіцці беларускай юрыдычнай навукі і адукацыі. З моманту адкрыцця факультэт стаў цэнтрам падрыхтоўкі высокакваліфікаваных юрыстаў і навуковых кадраў, якія ўнеслі значны ўклад у заканадаўства і прававую практыку Беларусі. Пра тое, як адзначаць юбілей і што плануецца ў будучыні, расказаў дэкан юрыдычнага факультэта Андрэй Шыдлоўскі.**

*– На ўвесь кастрычнік запланавана больш за 30 мерапрыемстваў. Кульмінацыяй з'яўляецца ўрачыстае адкрыццё Беларускага навукова-адукацыйнага кангрэса «Універсітэцкая прававая навука і юрыдычная адукацыя: да 100-годдзя юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта». Гэта будуць розныя канферэнцыі, круглыя сталы, дыялогавыя пляцоўкі, секцыі па канкрэтных галінах права. Падрыхтавана і выдадзена энцыклапедыя «Юрыдычны факультэт: гісторыя і сучаснасць: да 100-годдзя з дня заснавання». Па выніках кангрэса выдадзены зборнік навуковых матэрыялаў. 23 кастрычніка 2025 г. для студэнтаў і супрацоўнікаў падраздзялення адбудзецца святочны канцэрт у Вялікім тэатры Беларусі,* – дзеліцца Андрэй Шыдлоўскі.

## ГІСТОРЫЯ ЗАСНАВАННЯ І РАЗВІЦЦЁ

Гісторыя юрыдычнага факультэта неразрыўна звязана з гісторыяй развіцця беларускай дзяржаўнасці. Вытокі юрыдычнай навукі і адукацыі ў Беларусі знаходзяцца ў далёкай старажытнасці, калі ўпершыню на беларускіх землях у 1641 г. быў заснаваны юрыдычны факультэт у складзе Віленскай акадэміі, які пазней уваходзіў у склад Галоўнай школы ВКЛ (1773), Галоўнай Віленскай школы (1796), Віленскага ўніверсітэта (1803).

Адраджэнне развіцця беларускай юрыдычнай навукі і адукацыі звязана з адкрыццём у 1921 г. Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, які ўключаў пяць факультэтаў (рабочы, грамадскіх навук, медыцынскі, сельскагаспадарчы і фізіка-матэматычны). На факультэце грамадскіх навук функцыянавала прававое аддзяленне. Першым дэканам факультэта грамадскіх навук стаў прафесар У. М. Ігнатоўскі, а яго першымі выкладчыкамі былі Г. С. Гурвіч, У. М. Дурдзянеўскі, М. Б. Кроль, І. Т. Цітоў, М. В. Грэдзінгер, Б. В. Чрэдзін і інш. У 1925 г. БДУ выпусціў 130 юрыстаў.

У 1925 г. СНК Беларускай ССР пастанавіў адкрыць у Беларускім дзяржаўным універсітэце факультэт права і гаспадаркі. Дэканам прызначаны прафесар С. Я. Вольфсан. У 1925/1926 навучальным годзе на факультэце працавалі 12 прафесараў: У. І. Пічэта, С. Я. Вольфсан, А. В. Гарбуноў, М. В. Грэдзінгер, У. М. Дурдзянеўскі, М. В. Доўнар-Запольскі, С. З. Кацэнбоген, М. М. Краўчанка, М. А. Прыляжаеў, У. М. Перцаў, В. М. Шыраеў, Б. В. Чрэдзін.

## УКЛАД ТЫХ, ДЗЯКУЮЧЫ КАМУ МЫ ЖЫВЁМ

За векавы перыяд альма-матар быў пройдзены вялікі і значны шлях. Юрыдычная школа мела розныя назвы і арганізацыйна-прававыя формы дзейнасці: факультэт права і гаспадаркі (1925), факультэт савецкага будаўніцтва і права (1930), Інстытут савецкага будаўніцтва і права (1931), Беларускі дзяржаўны юрыдычны інстытут (1932), Мінскі юрыдычны інстытут (1938), юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1954). Аднак заўсёды галоўным кірункам дзейнасці юрыдычнай школы з'яўляецца падрыхтоўка высокакваліфікаваных юрыстаў, выхаванне годных грамадзян Айчыны.

*– Юбілей факультэта дазваляе ўспомніць важныя вехі і яскравыя старонкі гісторыі, а перш за ўсё людзей, якія яго стварылі, працавалі і вучыліся тут у розныя гады. Ветэраны вайны прыўнеслі ў юрыдычную навуку глыбокае разуменне справядлівасці і вяршэнства права, сфарміраваўшы ўнікальную прававую культуру, якая працягвае ўплываць на сучасную юрыдычную адукацыю і практыку.*

Заснавальнікамі многіх навуковых юрыдычных школ былі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, прадстаўнікі пакалення Пераможцаў – прафесары А. А. Галаўко, І. І. Гарэлік, В. А. Дарогін, С. Р. Драбязка, А. В. Дулаў, І. М. Ігнаценка, С. В. Курылёў, А. Ц. Лейзераў, Я. А. Мацвіенка, Г. А. Павецьеў, І. С. Цішкевіч, В. Ф. Чыгір, В. А. Шкурко, В. М. Шпілёў, М. Р. Юркевіч, Я. А. Юхо. Актыўны рух у развіцці юрыдычнай адукацыі ўніверсітэта задавалі франтавікі-выкладчыкі: дацэнты С. П. Бякешка, М. М. Гапановіч, К. В. Кічыгіна, М. М. Меркушаў, Я. Ф. Плюта, Я. М. Тагуноў, В. С. Швяцоў і інш.

Навуковыя школы за стагоддзе выхавалі не адно пакаленне таленавітых юрыстаў, высокаадукаваных спецыялістаў, годных грамадзян Беларусі, якія і зараз складаюць фундаментальны падмурак у падрыхтоўцы спецыялістаў для прававой сістэмы.

Вялікі ўклад у развіццё ўніверсітэцкай юрыдычнай адукацыі і навукі ўнеслі прафесары А. М. Абрамовіч, С. А. Балашэнка, Н. Л. Бандарэнка, А. У. Баркоў, В. М. Бібіла, Ю. П. Броўка, Р. А. Васілевіч, В. М. Гадуноў, І. А. Грунтоў, А. Я. Гучок, Т. І. Доўнар, А. Ф. Доўгань, А. М. Здрок, В. С. Камянкоў, Н. А. Карповіч, Т. І. Макарава, І. І. Марціновіч, М. В. Мяшчанава, Ю. І. Новік, А. Л. Савенак, М. В. Сторажаў, В. М. Талочка, Я. І. Функ, У. М. Хоміч, А. Г. Цікавенка, В. Г. Ціхіня, М. П. Чудакоў, В. І. Чупрыс, В. Б. Шабанаў, І. С. Шахрай, А. І. Швед, у развіцці палітычнай навукі – прафесары Н. А. Антановіч, Л. Я. Землякоў, Г. А. Круглова, С. В. Рашэтнікаў.




## ПЕРШЫЯ Ў НАВУЦЫ, РОЎНЫЯ Ў ПРЫЗНАННІ

На факультэце вучыліся і выкладалі ў розныя гады: першая жанчына – доктар юрыдычных навук – Ізабэла Іванаўна Марціновіч (прафесар, заслужаны работнік вышэйшай школы БССР, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь), першая жанчына-прарэктар БДУ Вольга Іванаўна Чупрыс (зараз – намеснік Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь).

*– Гэтыя жанчыны сталі сімваламі прагрэсу ў галіне роўнасці і пашырэння магчымасцяў у навуковай і адукацыйнай сферах Беларусі,* – падкрэсліў дэкан.

На працягу развіцця беларускай дзяржаўнасці навукоўцы юрыдычнага факультэта прымалі самы непасрэдны і актыўны ўдзел у распрацоўцы праектаў заканадаўчых актаў (у тым ліку кадыфікацыі).

Шэраг навукоўцаў факультэта ўключаны ў склад Прававога кансультатыўнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і групы экспертаў у галіне права пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Асноўныя склады дактароў юрыдычных навук ва ўсіх дзеючых доктарскіх саветах па абароне дысертацый па юрыдычных навуках у краіне прадстаўлены работнікамі юрыдычнага факультэ-

# ЮРЫСТАЎ АДЗНАЧАЕ ЮБІЛЕЙ

та ўніверсітэта. Навукоўцы факультэта ўваходзяць у навукова-кансультатыўныя саветы пры Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь, Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь, Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, Следчым камітэце Рэспублікі Беларусь, іншых органах дзяржаўнай улады і кіравання; з'яўляюцца членамі Вышэйшай кваліфікацыйнай калегіі суддзяў Рэспублікі Беларусь, вучонага савета Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, рэдкалегій і рэдсаветаў вялікага кола беларускіх і замежных юрыдычных навуковых і навукова-практычных часопісаў, навуковых зборнікаў і інш.

На базе юрыдычнага факультэта БДУ дзейнічае навукова-метадычны савет па групе спецыяльнасцяў «Права», які аб'ядноўвае ўсе ўстановы вышэйшай адукацыі краіны па падрыхтоўцы юрыстаў. Сапраўдны поспех і гонар факультэта – распрацоўка і выданне падручнікаў і навучальных дапаможнікаў (у тым ліку з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь), электронных навучальна-метадычных комплексаў, навукова-практычных каментарыяў, практыкумаў, даведнікаў па прававых пытаннях. У 2007–2014 гг. выдадзена чатырохтомная «Беларуская юрыдычная энцыклапедыя», з 2018 па 2025 год выходзіць у свет першы ў гісторыі беларускага крымінальнага права пяцітомны акадэмічны «Курс крымінальнага права» (цяпер завяршаецца работа над 4 і 5 тамамі).

Важна адзначыць, што з 1988 па 2016 г. факультэтам было выдадзена 27 зборнікаў «Права і дэмакратыя». А з 1969 г. выдаецца часопіс «Веснік БДУ. Серыя 3. Гісторыя. Эканоміка. Права» (тры разы ў год). На базе гэтых зборніка і часопіса ў 2017 г. быў выдадзены часопіс «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Права», які сёння з'яўляецца галоўным часопісам юрыдычнага напрамку ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Неаднаразова навуковыя і навучальна-метадычныя выданні супрацоўнікаў юрыдычнага факультэта БДУ станавіліся лаўрэатамі нацыянальных і міжнародных прэмій і ўзнагарод.

За векавую гісторыю юрыдычны факультэт падрыхтаваў больш за 35 000 юрыстаў. Сярод яго выпускнікоў – 84 заслужаныя юрысты Беларусі (БССР, Рэспублікі Беларусь), 3 заслужаныя дзеячы навукі Рэспублікі Беларусь, 3 заслужаныя работнікі адукацыі Рэспублікі Беларусь, 5 членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі. У іх ліку кіраўнікі вышэйшых органаў дзяржаўнай улады і дзяржаўных устаноў Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікі дыпламатычных місій і міжнародных арганізацый, вядомыя навукоўцы, грамадскія дзеячы, юрысты-практыкі.

## З ГОНАРАМ ІДЗЁМ У БУДУЧЫНЮ

Сучасны факультэт спалучае гістарычныя традыцыі класічнай юрыдычнай адукацыі з інавацыйнымі падыходамі ў фундаментальных і прыкладных даследаваннях.




Таксама факультэту ёсць чым ганарыцца. У 2021 г. абсталяваны навучальныя залы судовых пасяджэнняў. З 2021 г. праводзіцца штогадовы прафарыентацыйны і грамадзянска-патрыятычны рэспубліканскі турнір «Сіла Закона» (ахоплівае звыш 30 000 навучэнцаў у год). А ў 2023 г. адкрыта інавацыйная пляцоўка сумесна з Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Таксама падрыхтавана платформа для віртуальнага (лічбавага) музея факультэта. Выдадзена кніга-энцыклапедыя да 100-годдзя факультэта.

Факультэт славіцца перамогамі студэнтаў на сусветных (алімпійскія чэмпіёны, чэмпіёны свету), рэспубліканскіх спартыўных спаборніцтвах і інш. Знакавай падзеяй стала зацвярджэнне знака адзнакі «За заслугі»:

– *Гэта афіцыйны геральдычны сімвал, найвышэйшая ўзнагарода юрыдычнага факультэта БДУ, якая ўручаецца па рашэнні савета юрыдычнага факультэта за асаблівыя заслугі ў галіне юрыдычнай адукацыі, навукі і правапрымяняльнай практыкі,* – падкрэсліў дэкан.

На факультэце атрымліваюць агульную вышэйшую адукацыю каля 3000 навучэнцаў: 1500 – дзённая форма, 1100 – завочная форма, 150 – другая і наступная вышэйшая адукацыя (завочная форма). Паглыбленую вышэйшую адукацыю атрымліваюць каля 50 магістрантаў, паглыбленую вышэйшую адукацыю на англійскай мове – 250 студэнтаў (навучэнцы замежных дзяржаў).

У структуру факультэта ўваходзяць 12 кафедраў, цэнтр адукацыйных інавацый, аддзел «Юрыдычная клініка», навучальная лабараторыя крыміналістычнай тэхнікі і судовых экспертыз, крыміналістычны палігон, музей юрыдычнага факультэта. На факультэце функцыянуюць навуковыя цэнтры: міжнародны навукова-адукацыйны цэнтр медыяцыі, прымірэння і трацейскіх працэдур, цэнтр дзяржаўна-прававой палітыкі і кіравання, цэнтр устойлівага развіцця.

На факультэце выкладаюць больш за 250 выкладчыкаў, у тым ліку вядомыя юрысты-практыкі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, 23 дактары навук, прафесары і 143 кандыдаты навук, дацэнты. Падрыхтоўку ажыццяўляюць заслужаныя юрысты, дзеячы навукі і работнікі адукацыі, прафесары і дацэнты, самыя лепшыя тэарэтыкі і практыкі ў сферы юрыспрудэнцыі. Факультэтам усталяваны цесныя сувязі з дзяржаўнымі органамі і ўстановамі, юрыдычнымі кансультацыямі, юрыдычнымі кампаніямі, навуковымі ўстановамі Беларусі і краін СНД, Еўразійскай эканамічнай супольнасці.

– *Юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – флагман айчыннай юрыдычнай навукі і класічнай універсітэцкай юрыдычнай адукацыі; вядучы навукова-адукацыйны юрыдычны цэнтр краіны. Сапраўдны гонар юрыдычнага факультэта – адораныя студэнты, вопытныя выкладчыкі, найлепшыя выпускнікі! Жадаю калектыву юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і ўсім яго выпускнікам росквіту і радасных падзей, новых асабістых дасягненняў і памятных перамог, прафесійнага даўгалецця і ўдачы! Са 100-годдзем, родны факультэт!*

**Таццяна САВІЦКАЯ**



УНІВЕРСІТЭТ
16 кастрычніка 2025 года, №10 (2301)

# ІГАР МУЗАЛЕЎСКІ: «КІРАЎНІК ПАВІНЕН БЫЦЬ ПРАФЕСІЯНАЛАМ!»

**Творчыя калектывы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта вядомыя яскравымі нумарамі і запамінальнымі выступленнямі. Кожны з іх стаў неад'емнай часткай культурнага жыцця ўніверсітэта. На старонках газеты «Універсітэт» стартуе прект музея гісторыі БДУ «Размовы пра культуру і творчасць», дзе кіраўнікі калектываў падрабязней распавядуць пра асаблівасці сваіх напрамкаў, працу ў камандзе і творчы шлях. У гэтым матэрыяле ўспамінамі і разважаннямі падзеліцца мастацкі кіраўнік і галоўны балетмайстар заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля танца «Крыжачок» Ігар Юр'евіч Музалеўскі.**







**Ігар Юр'евіч Музалеўскі** нарадзіўся 30 чэрвеня 1963 г. у горадзе Арол (Расія). Харэаграфічную адукацыю атрымаў у Арлоўскім філіяле Маскоўскага дзяржаўнага інстытута культуры (цяпер – Арлоўскі дзяржаўны інстытут культуры). Падчас службы ў войску ўваходзіў у склад ансамбля песні і танца Маскоўскай ваеннай акругі. З'яўляўся салістам Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі». Творчы шлях працягнуў у Дзяржаўным ансамблі танца Рэспублікі Беларусь. З 1992 г. – саліст ансамбля танца «Крыжачок». З 2007 г. па цяперашні час з'яўляецца мастацкім кіраўніком і галоўным балетмайстрам ансамбля. У 2016 г. быў удастоены звання «Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь».

**З чаго пачаўся ваш шлях у прафесію?**
Навучанне ў Арлоўскім філіяле Маскоўскага дзяржаўнага інстытута культуры стала пачаткам майго творчага шляху. Там я атрымаў якасную рознабаковую падрыхтоўку. З цяплом успамінаю пра свае студэнцкія гады. Гэта быў цікавы шчаслівы час. З таго моманту цаню магчымасць пагутарыць з цікавымі людзьмі і пераняць іх досвед. Вялікі ўплыў на мяне як на спецыяліста аказала праца ў творчых калектывах: ансамбль песні і танца Маскоўскай ваеннай акругі, Беларускі дзяржаўны харэаграфічны ансамбль «Харошкі», Дзяржаўны ансамбль танца Рэспублікі Беларусь, заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль танца «Крыжачок». Усё гэта для мяне каштоўны і ўнікальны досвед. Лічу, што кіраўнік павінен быць прафесіяналам.

**Ці памятаеце вы свой першы працоўны дзень у якасці мастацкага кіраўніка ансамбля танца «Крыжачок»?**
Калі я прыйшоў у ансамбль у якасці мастацкага кіраўніка, мне трэба было нанова яго сфарміраваць і згуртаваць. Неабходна было па-новаму зірнуць на ўжо наяўны рэпертуар, прадумаць канцэпцыю будучых танцавальных нумароў. Таксама было важна ўмацаваць фізічную падрыхтоўку салістаў. Дагэтуль лічу гэта асновай паспяховых выступленняў.

**Як з часам змяніўся рэпертуар ансамбля?**
Асновай рэпертуару былі і застаюцца беларускія народныя танцы. Напрыклад, «Крыжачок», «Кросны», «Полька праз нагу», «Купалінка». Аднак цяпер, у стагоддзе высокіх тэхналогій і інфармацыі, актуальным з'яўляецца ўдасканаленне і развіццё. Хочацца прыўнесці штосьці новае ў звыклыя танцавальныя нумары. У той жа час «Крыжачок» выступае з танцамі народаў свету, напрыклад, з венесуэльскім танцам «Харопа». Ёсць у рэпертуары «Крыжачка» і такія эфектныя пастаноўкі, як «Пчолка», «Гусар», «Мора сустракае».

**Якімі якасцямі, на вашу думку, павінен валодаць танцор?**
Перш за ўсё ў танцора павінна быць дысцыплінаванасць. Менавіта паслядоўнае выкананне дзеянняў прыводзіць да жаданага выніку. Вельмі важнай лічу добрую фізічную падрыхтоўку, шмат увагі надаю гэтаму на рэпетыцыях. Таксама неад'емным складнікам з'яўляецца артыстычнасць і ўменне перадаць вобраз так, каб гледачу ўсё было зразумела.

**Як адбываецца пастаноўка новых танцавальных нумароў?**
З самага пачатку ў мяне ёсць выразны план заняткаў. Я разумею, чаго мне трэба дамагчыся ад калектыву на кожнай рэпетыцыі. Заўсёды павінен быць вынік. Вельмі важным лічу ўменне растлумачыць, як гэтага дасягнуць самым кароткім шляхам. Гэта карпатлівая праца. З першай хвіліны рэпетыцыі я рыхтую іх да апошняй хвіліны выступлення. Так праходзіць кожная рэпетыцыя дзень за днём, месяц за месяцам. Вялікі ўклад у падрыхтоўку танцавальных нумароў уносіць каманда прафесіяналаў: балетмайстар Ірына Какорына, канцэртмайстар Мікалай Чарнамораў, кіраўнік аркестра Сяргей Валахановіч. Суладная сумесная праца прыводзіць да добрага выніку.

**Як вы настройваеце калектыў перад выступленнем?**
Мне складана падзяліць рэпетыцыю і выступленне, таму што гэта адзіны працэс бесперапыннай працы. Канцэрт – вынік гэтай працы. Так ці інакш патрэбная добрая матывацыя. Я заўсёды імкнуся зацікавіць калектыў, каб яны прасякнуліся ідэяй танца і разумелі, дзеля чаго працуюць.

**Падзяліцеся, калі ласка, самым яркім успамінам, звязаным з ансамблем.**
Усе яны так ці інакш звязаны з выступленнямі. Падчас канцэртаў і гастроляў «Крыжачок» атрымлівае ўнікальны досвед і магчымасці. Асабліва запомнілася выступленне ансамбля ў г. Клайпеда, пасля якога з'явілася думка пра пастаноўку новага танцавальнага нумара «Мора сустракае». Ён стаў адным з самых вядомых у рэпертуары ансамбля.

**Якім дасягненнем ансамбля вы ганарыцеся больш за ўсё?**
Да моманту пачатку майго кіраўніцтва ансамбль ужо меў званне «народны», аднак некалькі гадоў яго не пацвярджаў. Першай мэтай стала пацвярджэнне дадзенага ганаровага звання. Пасля гэтага карпатлівая праца працягнулася і ўжо ў 2011 г. ансамбль быў удастоены звання «заслужаны». Лічу, што такія дасягненні добра паказваюць характар ансамбля, у прыватнасці, яго працавітасць.

**Што, на ваш погляд, адрознівае «Крыжачок» ад іншых ансамбляў танца?**
Думаю, гэта гісторыя стварэння ансамбля. Сімвалічна, што ён быў утвораны ў 1945 г., пасля Вялікай Айчыннай вайны. У няпростых умовах паваеннага часу новы танцавальны калектыў – сапраўднае адкрыццё і ў той жа час вялікая адказнасць. «Крыжачок» стаў пачаткам важнага этапу ў развіцці культурнага жыцця ўніверсітэта. Вось ужо 80 гадоў ансамбль жыве, працуе і ўдасканальваецца.

**Якім вы бачыце ансамбль у будучыні?**
Упэўнены, што калектыў працягне радаваць гледачоў новымі танцавальнымі нумарамі і адзначыць яшчэ не адзін юбілей.

## ДАВЕДКА

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль танца «Крыжачок» БДУ – гэта:
- 80 гадоў творчай дзейнасці
- Рэгулярныя канцэрты, выступленні і гастролі
- Званне «народны» ў 1969 г.
- Званне «заслужаны» ў 2011 г.
- Лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За значны ўклад у захаванне традыцый харэаграфічнага мастацтва і актыўны ўдзел у грамадска-культурным жыцці краіны» ў 2021 г.

**Дар'я АРТАМОНАВА**
**Фота: прэс-служба БДУ**

# «КОЖНЫ З ВАС — СУСВЕТ»: НАПАМІН РЭКТАРА ПЕРШАКУРСНІКАМ БДУ

**«Віват, першакурснік!» – гэтыя словы сталі для тысяч абітурыентаў доўгачаканым пропускам у новае, яркае жыццё. Штогадовае пасвячэнне ў студэнты БДУ не проста афіцыйная цырымонія, а маштабнае свята, якое на доўгія гады застанецца ў памяці кожнага ўдзельніка. Яно азначае пачатак вялікага падарожжа ў свет ведаў, самарэалізацыі і сапраўднага сяброўства, яднанне самых розных талентаў і характараў.**




Урачыстая традыцыя напоўнена аўрай адзінства і радаснага чакання. Тут, у сценах вядучай ВНУ краіны, закладваецца фундамент будучых здзяйсненняў, нараджаюцца трывалыя сувязі і набываецца тая асаблівая студэнцкая ідэнтычнасць, якая адрознівае выпускнікоў БДУ. Свята сімвалізуе не толькі старт акадэмічнага шляху, але і адкрыццё новай главы асабістай гісторыі кожнага, гісторыі, поўнай адкрыццяў, амбіцый і бязмежных магчымасцяў.

Па традыцыі ўсіх прывіталі дэканы факультэтаў, з віншавальным словам звярнуўся рэктар Андрэй Кароль. У сваёй прамове ён адзначыў асаблівы, непераўзыдзены дух, які пануе на гэтым штогадовым свяце. Ён заклікаў новае пакаленне студэнтаў убачыць у прывітальным дэвізе не проста фармальнасць, а сапраўдны жыццёвы арыенцір.

*– У выразе «Віват, студэнт!» закладзена глыбокае значэнне. Даслоўна фраза перакладаецца як «Хай жыве!». Але яе галоўная каштоўнасць – у важнасці знаходжання ў пастаянным руху, пошуку сябе, сваіх сэнсаў, пытанняў, самазмен. Гэта значыць, у поўнай сінхранізацыі сябе з дынамічным жыццём вакол,* – растлумачыў рэктар.

Па словах рэктара, магутнасць універсітэта заснавана на моцнай сувязі эпох і дыялогу паміж рознымі пакаленнямі навукоўцаў і студэнтаў.

*– Розныя шляхі і дарогі прывялі ў БДУ зусім розных людзей. Кожны з вас – гэта свой Сусвет, са сваім рытмам, каштоўнасцямі, місіяй і прызначэннем,* – падкрэсліў кіраўнік ВНУ.

Гаворачы пра ўнікальны статус універсітэта, Андрэй Кароль падкрэсліў яго фундаментальную ролю ў гісторыі нацыі. БДУ стаў калыскай беларускай вышэйшай адукацыі і адпраўным пунктам для фарміравання інтэлектуальнай эліты краіны.

*– Далейшая траекторыя ВНУ і развіццё краіны шмат у чым залежаць ад вашай ініцыятыўнасці, імкненняў, поспехаў у вучобе і самарэалізацыі,* – звярнуўся да аўдыторыі рэктар.

Ён заклікаў студэнтаў смела даследаваць новыя гарызонты, не спыняцца ў пошуку і пажадаў, каб гады вучобы былі поўныя здароўя, узаемаразумення з выкладчыкамі, насычаныя яркімі падзеямі.

Першы курс – асабліва важны і хвалюючы этап, калі закладваецца фундамент усяго будучага ўніверсітэцкага жыцця. Гэта час як стараннай вучобы, так і актыўнага ўключэння ў новую супольнасць і пошукаў сяброў.

Ад імя ўсіх студэнтаў выступіла курсантка ваеннага факультэта Ганна Мурашка, якая паказала найвышэйшы вынік на ЦТ і ЦЭ.

*– Сёння мы сталі часткай вялікай і сяброўскай сям'і БДУ. Гэта выклікае бясспрэчнае пачуццё гонару і накладае адказнасць. Цяпер ад нашых акадэмічных поспехаў, творчых і спартыўных дасягненняў залежыць сучаснае і будучае развіццё ўніверсітэта і ўсёй краіны,* – заявіла яна.

Дзяўчына пажадала кожнаму знайсці ва ўніверсітэце крыніцу натхнення для смелых ідэй, рабіць асабістыя і акадэмічныя адкрыцці, набыць надзейных сяброў і не баяцца прымаць лёсавызначальныя рашэнні. Разам з Ганнай усе першакурснікі прачыталі ўрачыстую клятву.







Самі студэнты чакаюць ад мерапрыемства яркіх уражанняў і незабыўных эмоцый. Студэнты з розных факультэтаў спадзяюцца, што вечар запомніцца выдатнай музыкай, запальнымі выступленнямі і магчымасцю весела правесці час з новымі сябрамі. Многія прызнаюцца, што першы месяц вучобы ва ўніверсітэце пераўзышоў іх чаканні: іх атачае сяброўская атмасфера, а выкладчыкі аказваюцца цікавымі і кампетэнтнымі настаўнікамі. Нягледзячы на некаторыя трывогі з нагоды будучай сесіі, пануе энтузіязм і жаданне актыўна праявіць сябе як у вучобе, так і ў студэнцкім жыцці, каб стаць часткай вялікага і згуртаванага калектыву БДУ.

Сваімі ўражаннямі падзяліліся і студэнткі-арганізатары, Вераніка і Яна. Дзяўчаты лічаць, што гэта сапраўды самае грандыёзнае і запамінальнае мерапрыемства ў БДУ!

*– Помнім, як на першым курсе ў нас дрыжалі рукі і бегалі мурашкі ад хвалявання – гэтыя эмоцыі застануцца з намі назаўжды. Зараз мы ўдзельнічаем ужо як арганізатары, і, хоць уражанні іншыя, каштоўнасць самой падзеі не змяняецца. Хочам пажадаць усім першакурснікам смела ўварвацца ў студэнцкае жыццё, не баяцца праяўляць сябе і паказаць усе свае магчымасці. БДУ – менавіта тое месца, дзе важна рэкамендаваць сябе з найлепшага боку, бо гэта абавязкова прынясе плён у будучыні. Жадаем вам цярпення, яркіх уражанняў і ўпэўненасці ў сваіх сілах!*

Валанцёры з філалагічнага факультэта лічаць, што першакурснікаў чакае неверагодна маштабная падзея, якая зарадзіць іх на ўсе гады вучобы. Па словах студэнтак другога курса, «Віват» – унікальная магчымасць сапраўды адчуць маштаб універсітэта, убачыць, колькі людзей збіраецца разам, і зразумець, што вы вучыцеся ў дзівосным месцы.

*– Свята не проста старт, а важны момант для знаёмства з аднагрупнікамі і выкладчыкамі. Жадаем усім першакурснікам выдатнага вечара і раім не прапусціць ніводнай магчымасці ў гэты асаблівы дзень,* – падсумавалі студэнткі.

«Віват» не сканчаецца, а толькі пачынаецца. Ён працягнецца на кожных занятках, дзе зададуць нязручнае пытанне, у кожнай лабараторыі, дзе паставяць смелы эксперымент, у кожнай студэнцкай ініцыятыве, якая зменіць жыццё ўніверсітэта да лепшага. Першакурснікі атрымалі матывацыю і адчулі сілу студэнцкага братэрства. Цяпер – час дзейнічаць: шукаць, памыляцца, знаходзіць і зноў шукаць. Час закахацца ў навуку, знайсці сяброў на ўсё жыццё і адкрыць у сабе сілы, пра якія яны і не падазравалі. Наперад, да новых здзяйсненняў! Віват, студэнт! Віват, БДУ!

**Марыя КАРКВЕЛІС**

УНІВЕРСІТЭТ
16 кастрычніка 2025 года, №10 (2301)

# У БДУ навукоўцы з шасці краін абмеркавалі праблемы камп'ютарнага аналізу даных і мадэлявання



Міжнародная навуковая канферэнцыя «Камп'ютарны аналіз даных і мадэляванне: стахастыка і аналіз даных» прайшла ў БДУ. Форум быў накіраваны на пашырэнне міжнароднага супрацоўніцтва, абмен досведам і перадавымі дасягненнямі сусветнай навуковай супольнасці ў галіне інфармацыйных тэхналогій.

Удзельнікамі канферэнцыі сталі больш за 70 навукоўцаў з Беларусі, Расіі, Кітая, Узбекістана, Азербайджана і Вялікабрытаніі. З вітальным словам на адкрыцці форуму выступіў прарэктар па навуковай рабоце БДУ Андрэй Блахін і дырэктар НДІ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі (НДІ ППМІ) акадэмік НАН Беларусі Юрый Харын.

У рамках чатырохдзённага навуковага мерапрыемства адбылася праца шасці секцый і двух пленарных пасяджэнняў. Эксперты абмеркавалі розныя метады аналізу складаных стахастычных даных, шляхі аптымізацыі сістэм штучнага інтэлекту, а таксама найноўшыя IT-распрацоўкі ў галіне эканомікі, фінансавай і банкаўскай дзейнасці, тэхнікі, медыцыны, генетыкі і абароны інфармацыі.

Адзначым, міжнародная навуковая канферэнцыя «Камп'ютарны аналіз даных і мадэляванне» (Computer Data Analysis and Modeling) праводзіцца з 1988 года з перыядычнасцю раз у тры гады. Гэта найбуйнейшы форум на еўразійскай прасторы ў галіне матэматычнай тэорыі і праграмавання.

Арганізатарамі канферэнцыі выступілі факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі і НДІ ППМІ БДУ.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## НАВІНЫ МІНСКА І БЕЛАРУСІ

Беларусы могуць атрымліваць больш за 400 паслуг на партале «Е-Паслугі» з дапамогай унікальнага ідэнтыфікатара. Гэта вызваляе ад неабходнасці электроннага подпісу. Ідэнтыфікатар выдаецца бясплатна і актывуецца праз двухфактарную аўтэнтыфікацыю па СМС. З яго дапамогай даступныя запыты даведак, звестак пра сацыяльныя выплаты, пенсіі і іншыя адміністрацыйныя працэдуры.

З 1 студзеня павысяць фінансаванне тэатраў і дзяржаўных бібліятэк. Напрыклад, субсідыі для вядучых тэатраў, такіх як Вялікі тэатр оперы і балета, вырастуць з 44,56 да 55,42 рубля. Таксама павялічаны базавы нарматыў для бібліятэк – з 69,9 да 78,76 рубля на аднаго карыстальніка ў год.

У Мінску скончыўся IX Міжнародны фестываль дакументальнага кіно «Еўразія.DOC». Галоўнай тэмай фестывалю стала захаванне гістарычнай памяці, што адлюстравалася ў праграме, прысвечанай 80-годдзю Вялікай Перамогі. Гран-пры атрымаў фільм «Вораг нумар тры» Уладзіміра Сумашэдава, а спецыяльны прыз ад Міністэрства інфармацыі – карціна «Ваенкары».

# Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб'яўляе конкурс
## на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу

| Найменне пасады | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|
| **Загадчык** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| **Прафесар** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 7 гадоў. |
| | [2] Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук ці навуковае званне прафесара, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| **Дацэнт** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| **Старшы выкладчык** | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў. |
| **Асістэнт** | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені) і стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 1 год. |

[1](дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

**Факультэт філасофіі і сацыяльных навук аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Прафесар кафедры сацыяльнай працы і рэабіліталагіі | 2 гады |
| Дацэнт кафедры сацыяльнай і арганізацыйнай псіхалогіі | 1 год |
| Дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі | 2 гады |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 528; да 14 лістапада.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 528; да 14 снежня.

**Хімічны факультэт БДУ аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій | 1 год |
| Загадчык кафедры арганічнай хіміі | 2 гады |
| Загадчык кафедры фізічнай хіміі і электрахіміі | 2 гады |
| Загадчык кафедры высокамалекулярных злучэнняў | 2 гады |
| Прафесар кафедры арганічнай хіміі [2] | 1 год |
| Прафесар кафедры аналітычнай хіміі [2] | 1 год |
| Дацэнт кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій | 2 гады |
| Дацэнт кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій | 1 год |
| Дацэнт кафедры неарганічнай хіміі (2) | 1 год |
| Дацэнт кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі | 1 год |
| Дацэнт кафедры аналітычнай хіміі (2) | 2 гады |
| Дацэнт кафедры аналітычнай хіміі | 1 год |
| Дацэнт кафедры высокамалекулярных злучэнняў | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій (2) | – |
| Асістэнт кафедры неарганічнай хіміі (2) | – |
| Асістэнт кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій | – |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, каб. 203; да 14 лістапада.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, каб. 203; да 14 снежня.

**Механіка-матэматычны факультэт аб'яўляе конкурс за замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу (2) | 1 год |
| Дацэнт кафедры вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання | 5 гадоў |
| Старшы выкладчык кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу | – |
| Старшы выкладчык кафедры вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі | – |
| Старшы выкладчык кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі | – |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, пр. Незалежнасці 4, каб. 207; да 14 лістапада.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, пр. Незалежнасці 4, каб. 207; да 14 снежня.

**Факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі аб'яўляе конкурс за замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры геадэзіі і космааэракартаграфіі (2) | 1 год |
| Дацэнт кафедры агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі | 1 год |
| Дацэнт кафедры рэгіянальнай геалогіі (2) | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі | – |
| Старшы выкладчык кафедры геадэзіі і космааэракартаграфіі | – |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16, каб. 314; да 14 лістапада.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16, каб. 213; да 14 снежня.

**Фізічны факультэт аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі | 1 год |
| Прафесар кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі | 1 год |
| Прафесар кафедры фізічнай оптыкі і прыкладной інфарматыкі | 1 год |
| Дацэнт кафедры фізікі цвёрдага цела і нанатэхналогій | 5 гадоў |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 315; да 14 лістапада.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 326; да 14 снежня.

**Факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Прафесар кафедры квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры радыёфізікі і лічбавых мэдыятэхналогій | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры фізічнай электронікі і нанатэхналогій | 5 гадоў |
| Старшы выкладчык кафедры тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій | бестэрмінова |
| Старшы выкладчык кафедры сістэмнага аналізу і камп'ютарнага мадэлявання | бестэрмінова |
| Старшы выкладчык кафедры інтэлектуальных сістэм | бестэрмінова |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Курчатава, 5, каб. 601; да 14 лістапада.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Курчатава, 5, каб. 605; да 14 снежня.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 16.10.2025 г.
Зак. 893. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*